# АДЛЮСТРАВАННЕ ПРАВАСВЯДОМАСЦІ САЦЫЯЛЬНЫХ КОЛАЎ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў СТАТУЦЕ 1529 Г.

*І. Л. Вяршок*

Адной з існуючых і дасканалых форм адлюстравання ці аб´ектывізацыі прававой свядомасці (правасвядомасці) насельніцтва ў эпоху існавання ВКЛ трэба назваць яго Статут 1529 г. Справа ў тым, што ў агульным тэарэтычным значэнні правасвядомась можа атрымліваць свае адлюстраванне ці выражэнне (аб´ектывізацыю) у markdown якасці. Яскравай формай аб ´ектывізацыі правасвядомасці з´яўляюцца асобныя нормы ці нарматыўныя прававыя акты. Якасць і эфектыўнасць рэалізацыі прававой свядомасці насельніцтва ў нарматыўным прававым акце ў значнай частке залежыць ад умоў, юрыдычных і фактычных асноў яго падрыхтоўкі і прыняцця.

Сярод умоў падрыхтоўкі і прыняцця нормaтыўных прававых актаў трэба назваць аб´ектыўныя і суб´ектыўныя фактары. Да першых можна аднесці міжнародныя і міждзяржаўныя адносіны ў вывучаемы перыяд, сацыяльна-эканамічнае становішча розных груп насельніцтва (класаў, сасловій), стан и якасць сістэмы іншых існуючых прававых норм таго часу, пануючую ў дзяржаве афіцыйную рэлігію (светапогляд) як адзін з бакоў дзяржаўна-ідэалагічнага парадку, этнічныя адносіны на тэрыторыі той ці іншай дзяржавы і за яе межамі і інш. Суб´ектыўнымі фактарамі падрыхтоўкі і прыняцця нарматыўных прававых актаў трэба прызнаць светапогляд і адукацыю, маральны стан суб´ектаў праватворчаскай дзейнасці і інш.

Юрыдычнымі асновамі падрыхтоўкі і прыняцця нарматыўнага прававога акта і на гэтай падставе рэалізацыі правасвядомасці ў гэтым акце трэба прызнаць прававыя нормы, якія вызначаюць і дапускаюць суб´ектаў да нарматворчай дзейнасці. Фактычнымі асновамі аб´ектывізацыі з´яўляюцца канкрэтныя гістарычныя факты, абставіны, з´явы, на якіх заснавана неабходнасць падрыхтоўкі нарматыўнага прававога акта.

Практычным увасабленнем гэтых агульнатэарэтычных тэзісаў з некаторымі асаблівасцямі можна назваць Статут 1529 г. Так, у кантэксце аналіза ўмоў рэалізацыі прававой свядомасці насельніцтва ВКЛ у Статуце 1529 г. трэба адзначыць некалькі асноўных аб´ектыўных фактараў.

Міжнароднае становішча таго часу складалася шляхам актыўнага палітычнага, эканамічнага і прававога ўзаемадзеяння ВКЛ з Маскоўскай і Польскай дзяржавамі. Таму нельга адмаўляцца ад факта пэўнага ўздзеяння адпаведных прававых сістэм на змест заканадаўчых актаў ВКЛ. Аднак пры вывучэнні зместа Статутаў многія прадстаўнікі гістарычнай і гісторыка-прававой думкі сцвярджаюць аб тым, што ў аснове Статута 1529 г. знаходзіцца мясцовае права. [1, стар. 103].

Зразумела, што нельга поўнасцю адмаўляць і факт рэцэпцыі асобных нормаў з адпаведных крыніц замежнага права. Напрыклад, складана не прызнаваць уплыў ідэй рымскага права, у тым ліку і ў працэсе сістэматызацыі права ВКЛ. Тым больш, што прычын да актыўнага ўспрымання такіх норм было шмат. Аднак ВКЛ змагло так якасна перапрацаваць айчынныя і замежныя элементы, што яны не толькі адказвалі патрабаванням гэтай дзяржавы, але таксама былі прыкладам для такіх розных па рэлігійнай прыналежнасці і характару прававой свядомасці суседзяў ВКЛ, як Польскае Каралеўства і Маскоўская дзяржава. Рэцэпцыя польскіх норм у прававую сістэму ВКЛ прывяла нават да таго, што некаторыя нормы інстытутаў права Польскага Каралеўства на тэрыторыі ВКЛ дзейнічалі больш эфектыўна [2].

Паступовы працэс цэнтралізацыі зямель у межах ВКЛ таксама аказаў значны ўплыў на фарміраванне і змест агульнадзяржаўнага заканадаўства – у тым ліку ў Статуце 1529 г. [3, стар.125]

Акрамя гэтага, самі заканадаўчыя акты ВКЛ адлюстравалі тагачасныя дасягненні прававой думкі Беларусі, якія былі абгрунтаваны ў працах Ф. Скарыны, С. Буднага, М. Ліцвіна, А. Волана і інш. На падставе аналізу названых гістарычных фактаў значная частка аўтараў прыходзіць да

высновы, што Статут 1529 г. з´явіўся практычным увасабленнем дамінуючых у той час філасофска-прававых канцэпцый. Такім чынам, стан прававой свядомасці насельніцтва ВКЛ у той час меў дастаткова высокі ўзровень, праяўляўся ў выглядзе тэарэтычнага абгрунтавання і практычнай апрабацыі існуючых ў той час прагрэсіўных філасофска-прававых ідэй. Аб гэтым сведчыць не толькі высокая (асабліва для феадальнага права) якасць саміх прававых норм (як вынік аб´ектывізацыі правасвядомасці суб´ектаў правааворчаства), але і іх эфектыўная рэалізацыя (як вынік аб´ектывізацыі правасвядомасці іншых слаеў насельніцтва ВКЛ).

Значнае ўздзеянне на змест і якасць рэалізацыі правасвядомасці ў Статуце 1529 г. на аб´ектыўным узроўні мелі канфесійныя і рэлігійныя ўзаемаадносіны. Сапраўды, прававыя акты канца XIV - пачатку XV стст. давалі прывілеі каталікам. Але падзеі 30-х гадоў XV ст. і паўстанне М. Глінскага ў пачатку XVI ст. паслужылі падставай для ліквідацыі дыскрымінацыйных мерапрыемстваў у адносінах да праваслаўных. Рэлігійная палітыка дзяржавы ў значнай меры змяніла напрамак, пачала спрыяць некатораму ўмацаванню пазіцый праваслаўнай царквы на тэрыторыі ВКЛ. Гэта палітыка знайшла адлюстраванне таксама і ў змесце Статута 1529 г. У гэтым Статуце Жыгімонт I зацвердзіў усе правы царкоўныя як лацінскага, так грэчаскага абрада [4, стар. 104].

Адзначым, што названы факт з´яўляецца яскравым адлюстраваннем практычнага ўзаемадзеяння рэлігійнай, дзяржаўнай і прававой свядомасці асоб, якія займаліся падрыхтоўкай Статута 1529 г. Больш за тое, названыя гістарычныя падзеі з´явіліся важным фактарам, які аказаў уплыў на змест названага нарматыўнага прававога акта. Да канца XVI ст. розніца паміж напрамкамі хрысціянскага веравызнання не была падставай для абмежавання шляхты беларускіх зямель у карыстанні палітычнымі правамі. Праваслаўную царкву падтрымлівала большасць насельніцтва, якая жыла на тэрыторыі ўсходнеславянскіх земляў ВКЛ.

Важнае значэнне для далейшага развіцця дзяржаўнасці і прававой

сістэмы мелі этнічныя працэсы у межах ВКЛ. У гэты час адбывалася адлюставанне ў свядомасці насельніцтва ВКЛ этнічнай прыналежнасці. Насельніцтва прызнавала ўладу Вялікіх князеў літоўскіх і успрымала сябе не толькі «литвинами», але ж і «русинами», а потым і «белорусцами». [5, стар. 105]

Некаторымі суб´ектыўнымі фактарамі, якія аказалі ўплыў на высокую якасць рэалізацыі прававой свядомасці, з´яўляюцца рэлігійныя каштоўнасці, узровень адукацыі, маральныя ўстаноўкі асоб, якія непасрэдна ці апасрэдавана прымалі ўдзел у падрыхтоўке і прыняцці Статута, асабістыя інтарэсы суб´ектаў ці іх групп. Стваральнікамі Статута былі высокаадукаваныя ў філасофскай, палітычнай і прававой галіне дзяржаўныя дзеячы ВКЛ.

Акрамя таго, палякі займаліся актыўным распаўсюджваннем каталіцызма паміж вялікалітоўскай шляхтай і самі накіроўваліся на тэрыторыю ВКЛ шляхам атрымання дзяржаўных пасад, куплі маенткаў, шлюбу з праваслаўнымі нявестамі і атрымання маенткаў у складзе пасагу. Пры падрыхтоўцы Статута 1529 г. палякам забаранялася атрымліваць зямельныя надзелы і займаць дзяржаўныя вялікалітоўскія пасады, што ў практычным плане не адбывалася.

Вышейназваныя фактары не з’яўляюцца адзінымі, якія паўплывалі на працэс адлюстравання правасвядомасці насельніцтва у Статуце 1529 г. Гэта дазваляе зрабіць вывад, што іх далейшы гістарычны аналіз можа даць аснову для агульнатэарэтычных вывадаў аб працэсах і асаблівасцях аб´ектывізацыі правасвядомасці ў працэсах беларускага джзяржавабудавання.

Літаратура

1. Дмитрачков П. От древней Руси до Речи Посполитой // Беларуская думка, август 2008 г. С. 102-105.

2. А. Закшевский. Великое княжество литовское в XIV-XVIII вв. Своеобразие права и государственного строя // http://www.historia.ru/2005/01/zakrzewski.htm по состоянию на 17.09.2009 г.

3. Дзербіна Г. Статуты ВКЛ як адлюстраванне палітычных ідэалау эпохі Рэнэсансу // Грамадскія ідэалы: нацыянальныя традыцыі, сучасны стан, погляд у будучыню: матэрыялы навуковай канферэнцыі / Мінск, 26-27 лістапада 1998 г. С.123-130.